**25.** Вызначце тып аднасастаўнага сказа:

*З ім можна было гаварыць і пра музыку, і пра мастацтва.*

**А)** назыўны. **Б)** пэўна-асабовы. **В)** няпэўна-асабовы.
**Г)** абагульнена-асабовы. **Д)** безасабовы.

**26.** *Новыя словы, якія ўзніклі нядаўна і не сталі агульнаўжывальнымі*, называюцца … .

**А)** архаізмы. **Б)** дыялектызмы. **В)** неалагізмы.
**Г)** фразеалагізмы. **Д)** гістарызмы.

**27.** У даўнія часы ў гэты дзень тыдня забаранялася пачынаць сяўбу, ісці ў сваты, збірацца ў далёкую дарогу, бяліць печ, прасці, купаць дзяцей. Пра які дзень тыдня ідзе гаворка?

**А)** панядзелак. **Б)** аўторак. **В)** серада. **Г)** чацвер. **Д)** пятніца.

**28.** Дадзены сказы:

1) Учора дзеці гулялі каля ясен.. да самага вечара.
2) Дзядуля зрабіў вельмі добрыя лыжкі з ясен.. .
3) Лісце дуб.., што рос на ўзлеску, доўга не ападала.
4) Дзядзька спусціў усё ж такі вясной лодку з дуб.. на ваду.

У якіх сказах у назоўніках замест пропуску неабходна напісаць канчатак ***-а(-я)***?

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**29.** Дадзены назвы птушак на рускай мове:

*1) трясогузка; 2) свиристель; 3) чибис; 4) ястреб; 5) филин; 6) ворон.*

Падбярыце адпаведнікі на беларускай мове і запоўніце клеткі красворда. Калі вы правільна выканаеце заданне, то ў выдзеленым вертыкальным радку прачытаеце слова, якое аб'ядноўвае ўсе гэтыя назвы.



*а) пугач; б) сітаўка; в) каршун;*
*г) амялушка; д) крумкач; е) кнігаўка.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-е, 6-д.
**Б)** 2-б, 3-в, 6-а, 5-е, 1-д, 4-г. **В)** 3-г, 4-д, 1-б, 2-е, 6-в, 5-а.
**Г)** 4-в, 5-а, 2-д, 3-г, 1-е, 6-б. **Д)** 5-а, 1-б, 4-в, 2-г, 6-д, 3-е.

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова адзначыў: *"Кожны гістарычны сюжэт – гэта адкрытая размова з сучаснікам"*?

**А)** К. Чорны. **Б)** У. Караткевіч. **В)** Л. Дайнека.
**Г)** І. Навуменка. **Д)** Я. Маўр.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 29700 экз. г. Мінск. 2015 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2015»

*Чацвер, 19 лютага 2015 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** У народзе здаўна існуе прыкмета:

*Калі раніцай туман ад зямлі і вады падымаецца ўверх і паступова рассейваецца, то днём будзе … .*

**А)** гарачае надвор'е. **Б)** навальніца. **В)** дождж.
**Г)** халоднае надвор'е. **Д)** пахмурна.

**2.** Колькі прыслоўяў ужыта ў вершаваных радках А. Гаруна?

*Кроплі разам, згодна, жвава,*
*Пояць усё, што хоча піць:*
*Збожжа, дрэвы, кветкі, травы…*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**3.** У якіх словах "схаваліся" лічэбнікі?

*1) трыа; 2) вітрына; 3) атрыбут; 4) трымценне; 5) трыпутнік.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 2, 5.

**4.** Дапоўніце народнае выслоўе.

*Лета збірае, а зіма… .*

**А)** зберагае. **Б)** хавае. **В)** раскідае. **Г)** чакае. **Д)** паядае.

**5.** Выберыце правільна напісаныя словы:

*1) у вадзе; 2) на зямле; 3) на рабоце.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**6.** Колькі зваротных дзеясловаў ужыта ў вершаваных радках А. Пысіна?

*Зззяла бліскавіцамі, усміхалася зарніцамі,*
*Папараццю цвіла.*
*Усміхалася, смяялася, у возеры купалася*
*Да белага святла.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**7.** Спакон вякоў у народзе лічылі, што гэты куст таксама цвіце, але толькі ўначы на Звеставанне ці ў Чысты чацвер. Па вераваннях нашых продкаў, хто сарве і захавае першы цвет гэтага куста, той хутчэй знойдзе скарб у купальскую ноч. Пра які куст ідзе размова?

**А)** пра шыпшынавы. **Б)** пра бэзавы. **В)** пра арэхавы.
**Г)** пра агрэставы. **Д)** пра лазовы.

**8.** *Спецыяліст па лесаводству* называецца … .

**А)** лясун. **Б)** лесавік. **В)** ляснік. **Г)** ляснічы. **Д)** лесавод.

**9.** Ігнат выпісваў з тэксту словы з канчаткамі:

*1) высокі; 2) збоку; 3) ноч; 4) думаючы; 5) пойдзем; 6) краіна.*

Якія словы хлопчык запісаў памылкова?

**А)** усе прыклады выпісаны правільна. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 6.

**10.** Выберыце словы, у якіх правільна пастаўлены націск:

*1) ма□ленькі; 2) ці□хенькі; 3) ні□зенькі; 4) ста□рэнькі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)**3, 4.

**11.** Спрадвеку гэта рэч выкарыстоўвалася ў народных звычаях і абрадах: у час хрышчэння, на зажынках абавязкова ахіналі сноп у хаце. Нават лічылі сімвалам роду. Пра якую рэч ідзе гаворка?

**А)** завушніцы. **Б)** пярсцёнак. **В)** пояс. **Г)** пакрывала. **Д)** ручнік.

**12.** У якіх словах на месцы прпуску напішаце літару ***е***?

*1) шын..ль; 2) інтэрн..т; 3) камюнік..; 4) тун..ль; 5) рэзюм..*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**13.** Маша, Ігнат і Арына атрымалі заданне выпісаць з тэксту састаўныя лічэбнікі. Маша выпісала *трыццаць чатыры, семсот*. Ігнат – *трыццаць пяць, семдзясят шэсць*. Арына – *шаснаццаць, пяцьдзясят пяць*. Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** усе дапусцілі памылкі. **В)** Маша. **Г)** Ігнат. **Д)** Арына.

**14.** Які адпаведнік у беларускай мове мае руская назва расліны ***плаун***?

**А)** лотаць**.** **Б)** дзераза. **В)** глог. **Г)** падвей. **Д)** трыснёг.

**15.** Выберыце правільна запісаныя дзеепрыметнікі:

*1) ухвалены; 2) выяўляны; 3) звезены; 4) склеяны; 5) зведзяны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**16.** Словы *мокры снег – халепа* з’яўляюцца … .

1) сінонімамі; 2) антонімамі; 3) амонімамі; 4) паронімамі.

Выберыце правільны варыянт.

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**17.** Колькі мяккіх зычных у словах вершаваных радкоў Г. Бураўкіна?

*Непрыкметна пад вятрамі*
*Дрэвы скінулі ўбор,*
*З неба зноў зляцелі самі*
*Мухі белыя на бор.*

**А)** 11. **Б)** 12. **В)** 13. **Г)** 14. **Д)** 15.

**18.** Што за дрэва? Драўніна яго выкарыстоўвалася для вырабу зброі, прыладаў працы, рознага начыння, посуду. Лісце, кара і насенне шырока выкарыстоўвалася ў народнай медыцыне. Паводле народных уяўленняў, яго вясновы сок быў смяротны для змей. У міфалогіі гэта дрэва лічылася Сусветным дрэвам. Там, дзе яно расце, вельмі рэдка можна ўбачыць дуб.

**А)** асіна. **Б)** ясень. **В)** таполя. **Г)** бяроза. **Д)** вольха.

**19.** Дадзены сказы:
1. Ласяня ідзе з ласіхай на вадапой.
2. Дваццаць пяць яблынь і груш выраслі ў калгасным садзе.
3. Трое маленькіх кацянят прыцiснуліся адно да аднаго, калі пачаўся дождж.

У якіх сказах выказнік ужыты правільна?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**20.** Выберыце з дадзеных назоўнікі мужчынскага роду:

*1) бездараж; 2) накіп; 3) рукапіс.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**21.** Які прыналежны прыметнік запісаны правільна?

*1) Вераў; 2) Танеў; 3) сястрын.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3**.**

**22.** Выберыце словы з дадзеных, якія пішуцца разам:

*1) (сон)трава; 2) (лён)даўгунец; 3) (борт)інжынер.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**23.** Які беларускі горад у свой час называлі “маленькай сталіцай рэнесансу”?

**А)** Мінск. **Б)** Гродна. **В)** Віцебск. **Г)** Полацк. **Д)** Навагрудак.

**24.** Які літаратурны жанр выкарыстоўваўся ў творчасці і Я. Коласам, і У. Караткевічам, і А. Макаёнкам?

*1) паэзія; 2) проза; 3) драматургія.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.